# [Сёння Беларуская пошта правядзе «Дзень посткросэра»]

Прома-мерапрыемства "Дзень посткросэра» пройдзе 7 снежня 2016 года ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі рэспублікі.

Postcrossing (посткросінг) - папулярны міжнародны online-праект па абмене паштовымі карткамі і маркамі, хобі, якое аб'ядноўвае людзей з розных куткоў планеты! Тысячы паштовак штодня разлятаюцца па ўсім свеце. Рэспубліка Беларусь - адна з лідзіруючых краін па іх колькасці. РУП «Белпошта» актыўна падтрымлівае рух посткросінг. З 2009 г. распрацавана больш за 500 сюжэтаў паштовых картак на розную тэматыку: «Беларусь», «Фауна і флора Беларусі", "Беларуская народная вопратка", "Беларускія рамёствы», «Святы і абрады беларусаў», «Мастацтва», «Дзіцячыя малюнкі " і інш.

Каб стаць посткросэрам, неабходна зарэгістравацца на сайце http://www.postcrossing.com/, указаць свой дамашні адрас і кароткую інфармацыю пра сябе (захапленні, пажаданні, якія паштоўкі вам падабаюцца, што вы хочаце даведацца пра іншую краіну), і адправіць паштоўкі пяці жыхарам розных краін, адрасы якіх прапануе сістэма сайта. Праз некаторы час вы знойдзеце ў паштовай скрыні маляўнічыя паштоўкі з усяго свету!
Падарожнічайце па свеце разам з посткросінгам!

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/07-12-2016-1417*